Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

5 КРАСАВІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 65 (26178)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?

Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 11 красавіка ў пятніцу з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

Спробы прыціснуць Беларусь эканамічнымі санкцыямі дарэмныя

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 красавіка даў інтэрв'ю в'етнамскім СМІ: радыё «Голас В'етнама» і В'етнамскаму інфармацыйнаму агенцтву.

У бліжэйшы час плануецца афіцыйны візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў гэту краіну. Таму в'етнамскіх журналістаў цікавілі як мэты маючага адбыцца візіту, узровень узаемаадносінаў Беларусі з В'етнамам і плануемыя меры па паляпшэнні двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, так і палітычнае і эканамічнае развіццё нашай рэспублікі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь разлічвае павялічыць тавараабарот з В'етнамам. На думку кіраўніка дзяржавы, яго ўзровень на сёння не адпавядае існуючаму патэнцыялу. Таму павышэнне двухбаковага тавараабароту з'яўляецца найважнейшай мэтай візіту Прэзідэнта Беларусі ў В'етнам. «Маючы такія традыцыі, бліскучыя палітычныя адносіны, адносіны паміж народамі, мы не маем нармальнай базы ў выглядзе тавараабароту. Нам трэба яго павялічыць, і рабіць гэта трэба неадкладна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён паведаміў, што беларускі бок мае намер запрасіць бізнэсменаў В'етнама ўважліва вывучыць нашу краіну, каб яны стваралі тут свае вытворчасці і праз Беларусь маглі гандляваць з усім заходнім светам. Для гэтага наша краіна гатова прапанаваць в'етнамскім бізнэсменам самыя лепшыя ўмовы, дадаў кіраўнік дзяржавы. Гаворачы аб эканамічным становішчы рэспублікі, Прэзідэнт падкрэсліў, што калі б Беларусі не перашкаджалі развіваць эканоміку, то яна прырастала б яшчэ большымі тэмпамі. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь «спрабуюць прыціснуць санкцыямі». «Гэта дарэмныя спробы. Мы знойдзем рынкі збыту сваёй прадукцыі», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што, нягледзячы на пэўныя шурпатасці, Беларусь у бліжэйшы час з усімі краінамі выбудуе нармальныя адносіны. «Мы ні з кім не хочам сварыцца: ні з Усходам, ні з Захадам. Думаю, што нармалізуюцца адносіны з амерыканцамі, ёсць перспектывы нармалізацыі адносінаў з Еўрасаюзам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я не бачу ніякіх праблем ва ўзаемаадносінах Беларусі з астатнім светам».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Укараненне аўтаматызаваных сістэм кантролю за цеплаэнергіяй у ЖКГ неабходна паскорыць

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў ходзе наведвання цэнтральнай кацельні КУП ЖКГ Шумілінскага раёна. Эканамічны эфект ад укаранення аўтаматызаванай сістэмы кіравання і збору даных па цепла-, энерга- і водазабеспячэнні 390 жылых дамоў за год склаў Br146 млн.

Сяргей Сідорскі ў ходзе рабочай паездкі ў Шумілінскі раён азнаёміўся з работай мясцовага філіяла ААТ «Малако» па ўкараненні перадавых тэхналогій у вытворчасці малочнай прадукцыі.

БЕЛТА.

Звяздоўскія прызы — шчасліўчыкам

Учора у сценах рэдакцыі прайшоў штоквартальны розыгрыш прызоў сярод прыхільнікаў газеты «Звязда» па выніках падпіскі на 2-і квартал 2008 года: на кон было выстаўлена каля трох дзесяткаў каштоўных падарункаў, сярод якіх майкі, бейсболкі, настольныя гадзіннікі, мікрахвалевая печ, каляровы тэлевізар і халадзільнік. Па традыцыі, вяршыцелямі лёсу ўсяго прызавога фонду сталі нашы госці. На гэты раз сваіх гаспадароў звяздоўскія прызы знайшлі з лёгкай рукі намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірыны Саксонавай *(на здымку злева)* і нашай пастаяннай чытачкі з Мінска Эмілі Васілевіч. Падрабязнасці розыгрышу і спісы шчаслівчыкаў — у бліжэйшым нумары газеты.

Кар. «Звязды».

Фота Яўгена ГЯСЕЦКАГА.

Фота БЕЛТА.

ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

ПАД МАСКАЙ САБЕСА

Як нас дураць

З усёй разнастайнасці махляроў менавіта гэтыя выклікаюць найбольшую агіду. Бо з уласцівым для баязліўцаў нахабствам яны рабуюць толькі самых безабаронных: як правіла, адзіноких састарэлых людзей. Прычым дзейнічаюць гэтыя зладзеі сярод белага дня. Іх галоўная зброя — крывадушнасць, іх «любімая маска» — работнік сабеса. Аднак у некаторых выпадках яны мяняюць «легенду» і пераўвасабляюцца ў слесараў, сантэхнікаў і іншых прадстаўнікоў жыллёва-камунальнай службы. Вось самыя «свежыя» і тыповыя прыклады дзейнасці крывадушных крыўдзіцеляў састарэлых, пра якія «Звязда» распавёў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Аляксандр НАЙДЗЯНКА.**

...Дзесьці а палове чацвёртай гадзіны дня ў кватэру 78-гадовай жыхаркі сталіцы пазванілі дзве прывітлівыя дзяўчыны. Яны назваліся работніцамі мясцовага ЖЭСа і паведамілі, што камунальнікі збіраюцца зрабіць бясплатны рамонт у яе кватэры, а для гэтага ім неабходна агледзець стан памяшкання. Узрадаваная бабуля пусціла незнаёмых людзей у кватэру. Адна з няпрошаных гасцей адразу ж распачала шчырую размову з гаспадарамі жылля, а другая накіравалася ў спальню нібыта для вызначэння «фронту рамонтных работ». Літаральна праз тры хвіліны яна скончыла агляд, запэўніла гаспадароў, што днямі прыйдуць рамонтнікі. Пасля іх візіту пенсіянерка зайшла ў спальню і заўважыла, што дзверцы шафы, дзе захоўваліся сямейныя зберажэнні, не зачынены. Здабычай няпрошаных гасцей сталі 500 тысяч рублёў.

Пад выглядам работнікаў сабеса зладзеі зайшлі ў кватэру 60-гадовай мінчанкі і выкралі 8 тысяч долараў, 150 тысяч рублёў, а таксама 12 залатых вырабаў.

У амаль аналагічную пастку трапіла і 67-гадовая бабуля з вуліцы Якуба Коласа. Толькі ёй дзве «дабрадзейкі» прапанавалі ўстанавіць лічыльнікі газу і вады. Далей усё пайшло па вядомым сцэнарыі. Адна прайдзісветка на кухні вяла шчырую размову з бабуляй: цікавілася станам здароўя, абяцала дапамагчы купіць неабходныя лекі і прадукты харчавання, а хаўрусніца ў той час «шуравала» па кватэры ў пошуках грошай. Праз паўгадзіны госці пакінулі гэтае жыллё. Бабуля нічога не падазравала. Прапажу 180 долараў і 200 тысяч рублёў выявіў яе сын, калі ўвечары вярнуўся з працы.

Між іншым, гэта не самы буйны «ўлоў» махлярак. Напрыканцы сакавіка, назваўшыся сацыяльнымі работнікамі, яны зайшлі ў кватэру 60-гадовай мінчанкі і выкралі 8 тысяч долараў, 150 тысяч рублёў, а таксама 12 залатых вырабаў. Усяго ж з пачатку года на рахунку такіх «сабесаўцаў» толькі ў сталіцы 23 кватэрныя крадзяжы. Міліцыя падазрае, што пераважную большасць гэтых злачынстваў здзейснілі тры асобы цыганскай нацыянальнасці, адна з якіх перафарбавана ў бландзінку. Дзейнічалі махляркі нахабна. Сярод белага дня заходзілі ў пад'езд, выбіралі абшарпаныя дзверы і званілі. Калі на парозе з'яўляліся маладыя гаспадары жылля, то тлумачылі, што пераблыталі адрас і ветліва папрасіўшы прабачэння, знікалі. А вось, калі дзверы адчынялі састарэлыя людзі, то аферысткі адразу ж начаплялі маскі работнікаў сабеса альбо ЖЭСа і выказвалі пажылым асобам заманлівыя прапановы наконт рамонту кватэры, устаноўкі лічыльнікаў вады, газу і г.д. Трапіўшы ў кватэры, зладзейкі без асаблівых праблем і даволі хутка знаходзілі і выкрадалі грошы, а таксама каштоўныя рэчы: «сабесаўцы» цудоўна ведаюць усе патаемныя схованкі пенсіянераў. Зусім верагодна, што памянёная група махлярак усё яшчэ «гастралюе» па Мінску альбо ў іншых населеных пунктах Беларусі. Злавіць такіх злачынцаў не вельмі проста. Састарэлыя людзі, як правіла, дрэнна запамінаюць іх прыкметы і міліцыі цяжка скласці дакладны фотаробат падазроных. Таму Аляксандр Найдзянка заклікае пенсіянераў быць больш пільнымі. Найперш, ён раіць не верыць на слова няпрошаным гасцям, нават калі яны называюцца работнікам сабесаў альбо ЖЭСаў і абяцаюць «залатыя горы». У любым выпадку, не трэба саромецца папрасіць у такіх візіцёраў дакументы. Больш за тое, нават пасля прад'яўлення пасведчанняў не спяшайцеся адчыняць незнаёмцам дзверы. Не лішнім будзе патэлефанаваць у адпаведныя ўстановы і пацікавіцца, ці накіроўвалі яны свайго супрацоўніка і як ягонае прозвішча. Калі ж, паважаныя бабулі і дзядулі, вы ўсё ж пусцілі няпрошаных гасцей у кватэру, а толькі потым зразумелі сваю памылку, то выправіць яе яшчэ не позна. Галоўнае ў такіх выпадках не марудзіць, а паклікаць суседзяў ці патэлефанаваць у міліцыю. У такіх выпадках махляры звычайна палохаюцца і адразу ж знікаюць. Прычым з пустымі рукамі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Рэха публікацыі

З зямлёй пытанне вырашаецца. А з дэбюракратызацыяй?

У нумары «Звязды» ад 28 лютага на першай паласе было надрукавана апытанне чытачоў на тэму дэбюракратызацыі: як хутка (у адпаведнасці з вызначанымі тэрмінамі) вырашаліся іх асабістыя пытанні пры звароце ў розныя інстанцыі, ці сутыкаліся яны апошнім часам з фактамі бюракратызму?

Сярод іншых сваё меркаванне па азначанай тэме выказалі і Людміла і Канстанцін Дрозд з вёскі Леткаўшчына Слуцкага раёна. У прыватнасці, да ўзятага ў арэнду гектара зямлі яны хацелі б узяць яшчэ два гектары, каб вырошчваць розную вітамінную прадукцыю. «Праблема ўзнікла з-за землекарыстальніка, які прыязджае да нас па серадах, — гаварылі тады нашы чытачы. — Маўляў, вы ўсё вырашайце: і са старшынёй, і з сельсаветам, рыхтуйце паперы, а я потым подпіс пастаўлю. На працягу месяца муж тройчы падыходзіў да яго з гэтай праблемай, фактычна прасіў, каб чалавек выканаў свае службовыя абавязкі. Апошні раз ён адправіў нас па вядомым адрасе, маўляў, надакучылі...»

Зварот вяскоўцаў адносна перадачы ў арэнду зямельнага ўчастка плошчай два гектары для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны ў Слуцкім райвыканкаме.

«Пры праверцы землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службай фактаў... установлена, што, на падставе пададзенай гр. К.К. Дрозд заявы ад 27.02.2008 года аб прадастаўленні зямельнага ўчастка плошчай два гектары ў вёсцы Мусічы для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, спецыялістамі сельвыканкама і СВК «Леткаўшчына» ў яго прысутнасці арганізаваны падбор зямельнага ўчастка. Пасля гэтага на адрас РУП «Праектны інстытут Белгіпразем» ад Маяцкага сельвыканкама накіравана даручэнне на выкананне работ па распрацоўцы праекта адводу зямельнага ўчастка ва ўстаноўленым парадку. Копія даручэння накіравана і заяўніку.

У далейшым падрыхтаваная дакументацыя будзе разгледжана на пасяджэнні сельвыканкама і пасля прыняцця рашэння аб перадачы зямельнага ўчастка ў арэнду заяўнік зарэгіструе гэта права ў Слуцкім філіяле РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры». Грамадзянін з прапанаваным варыянтам згодзен».

Мы рады за нашых заяўнікаў, калі гэта сапраўды так і па сутнасці іх пытанне вырашаецца, калі з прапанаваным варыянтам яны згодныя. Але нагадаем, што папярэдняя публікацыя была прысвечана тэме дэбюракратызацыі. Лагічнай была б з боку раённых уладаў і праверка менавіта гэтых фактаў (на якія прама ўказвалі чытачы) з іх далейшай ацэнкай у выпадку пацвярджэння. Не з мэтай пакарання нейкіх канкрэтных асобаў, колькі дзеля прадухілення ўзнікнення падобных сітуацый у далейшым. Аднак менавіта па гэтым баку праблемы ў афіцыйным адказе не было сказана ніводнага слова. Чаму?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрнае пытанне

Ці паселяць маці ў інтэрнаце?

Мы (сям'я з 3 чалавек) жывём у сямейным інтэрнаце. У нас тут два асобныя пакоі... Ці можна будзе ў адзін з іх забраць з вёскі маю маці (яна ў апошні час стала моцна хварэць, мае патрэбу ў доглядзе)?

Г. Ж., *г. Гомель.*

Палажэннем аб інтэрнатах (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 1999 г. № 1437, у рэдакцыі пастановы ад 14 снежня 2005 г. № 1441) не прадугледжана магчымасць усялення ў інтэрнат бацькоў асобаў, якія пражываюць у інтэрнаце. Згодна з пунктам 34 Палажэння, грамадзяне, якія займаюць у інтэрнаце ізаляваныя жылыя памяшканні, прызначаныя для пражывання сем'яў, маюць права ўсяляць у іх толькі сваіх непаўнагадовых дзяцей і мужа (жонку), не забяспечаных жыллём у дадзеным населеным пункце па норме.

Гэта ж норма ўтрымліваецца і ў Тыпавым дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце (зацверджаны пастановай Савета Міністраў ад 17 сакавіка 2006 г. № 370).

Віктар САВІЦКІ.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08065

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.04.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	3 371,19
1 латвійскі лат	4 830,54
1 літоўскі літ	976,13
1 чэшская крона	135,19
1 польскі злоты	968,40
1 расійскі рубель	90,90
1 украінская грыўня	430,72

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,5982
10 UAH	46,8358
1000 BYR	10,9895
EUR	36,9760

Курс у гандлёвых кампаніях (на 04.04.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

13.05.2008 г. проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства объектов:

№ лота	Объект, общая площадь (кв.м), адрес	Начальная цена (бел. руб)	Задаток (бел. руб)
1	Здание мебельного цеха (цех механической обработки), *503 кв.м*, кирпичное здание, крыша – жесть, электроосвещение, отопление от собственной котельной — г.п. Радошковичи, ул. Советская, д. 16	76 873 119	10 %
2	Здание конторы (двухэтажное, кирпичное), *1105 кв.м*, д. Марково, Молодечненский район	88 557 705	10 %
3	Незавершенное строительством законсервированное капитальное строение (3-этажная кирпичная пристройка к корпусу № 17 «а», перекрытия ж/б, внутренняя электропроводка, канализация, водопровод, готовность — 87 %), *1598,4 кв.м*, г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	643 647 060	5 %
4	Административно-бытовая пристройка (3-этажное кирпичное здание, перекрытия ж/б), *3898,3 кв.м*, г. Молодечно, ул. Замковая, 19	764 424 900	5 %
5	**1)** Корпус 16 Б, АСУП *(1216,1 м.кв)*; (3-этажное кирпичное здание, перекрытия ж/б, центр. отопление, водопровод, канализация, электроснабжение); **2)** Прессовый участок пластмасс, (пристройка к корпусу № 16 Б), *199,1 кв.м*; **3)** Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *422,1 кв.м*; **4)** склад готовой продукции (корпус 16 Б), *397,1 кв.м*; **5)** два металлических навеса для хранения тары при корпусе 16 Б *(142 кв.м, 119 кв.м)*; **6)** пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *298,2 кв.м* — расположенные по адресу: г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	670 400 000	5 %
6	Корпус административно-бытовой и производственный (3-этажное кирпичное здание, перекрытия ж/б, водопровод, канализация, электроснабжение, отопление), *2780,6 кв.м*, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 56	1 559 406 790	50 000 000
7	Здание столовой (3-этажное, с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции; стены – кирпичные, панельные, с ж/б колоннами, центр. отопление от ТЭЦ); *5378,2 кв.м*; оборудование — трансформатор ТМ 400/10/04; подстанция трансформаторная ТРП — г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	2 164 752 500	50 000 000

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13 мая 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **12 мая 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»,УНП 690324015.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА ВЫХАДНЫЯ ДА ПЛЮС 18!

У суботу і нядзелю да нас завітаюць цёплыя паветраныя масы з боку поўдня еўрапейскай часткі Расіі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

Таму на выхадныя чакаецца цёплае надвор'е, месцамі з кароткачасовымі дажджамі. Вецер паўночна-ўсходні, слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы 3—9 градусаў цяпла, удзень у суботу 12—18, у нядзелю 9—16 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, яшчэ ў панядзелак захаваецца цёплае і сонечнае надвор'е, а вось з аўторка да нас завітаюць паветраныя франты з боку Заходняй Еўропы, якія прынясуць кароткачасовыя дажджы па ўсёй тэрыторыі краіны. Тэмпература паветра ўдзень чакаецца ад 7 да 13 градусаў, а па паўднёвым усходзе да 15—17, уначы — 3—9 градусаў цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

МАШЫНА БЕЗ ВАДЗІЦЕЛЯ ЗА РУЛЁМ ЗБІЛА ПЕШАХОДА НА ПЕРАХОДЗЕ Ў МІНСКУ

Аб гэтым паведаміў старшы інспектар ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрый Красноў.

Здарэнне адбылася на вуліцы Някрасава на рэгулюемым пешаходным пераходзе. Калі пешаход ужо амаль перайшоў праезную частку, адчуў удар і быў збіты легкавым аўтамабілем. Машына «Мазда» без вадзіцеля працягвала рух па схілу дарогі, пакуль не ўпёрлася ў бардзюр. Пацярпелы атрымаў траўмы і быў шпіталізаваны ў гарадскую клінічную бальніцу. Як было ўстаноўлена са слоў уладальніка, перад тым як пайсці на працу, ён паставіў аўтамабіль на ручны тормаз, пасля чаго і адбыўся самавольны рух.

У ДАІ адзначылі, што гэта дастаткова рэдкі від ДТЗ. Тым не менш, у ім вінаваты менавіта вадзіцель.

Юрый Красноў падкрэсліў, што ў ПДР ёсць спецыяльны пункт, дзе гаворыцца, што вадзіцель абавязаны пакідаць транспартны сродак толькі ў тым выпадку, калі прыняты меры, якія выключаюць самавольны рух транспартнага сродку. Пакідаць аўтамабіль можна, толькі паставіўшы яго на ручны тормаз і ўключыўшы перадачу. Паркаваць машыну неабходна пад вуглом да бардзюра, а на схіле дарогі рулявое кола павінна быць пад вуглом да бардзюрнага каменя.

Кар. БЕЛТА.

НА ДАБРАВЕШЧАННЕ — МАСАВЫ ПРЫЛЁТ ПТУШАК

У народзе заўсёды лічылася, што якраз на свята Дабравешчання, або як яго яшчэ называюць «Саракі», у Беларусь прылятае большасць пеўчых птушак. Менавіта ў першы тыдзень красавіка ў нашу краіну прыляцелі галасістыя пячораўкі і малінаўкі, паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін. Зараз нават у гарадскіх парках ва ўсю сілу спяваюць драздоў. А вось галоўны спявак нашай краіны салавей прылятае ў Беларусь толькі ў апошнюю дэкаду красавіка.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЖКГ БУДУЦЬ СТВАРАЦЬ ЖЫЛЫ ФОНД ДЛЯ ПЕРАСЯЛЕННЯ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ

Аб гэтым паведаміў міністр ЖКГ Уладзімір Белахвостаў.

Паводле яго слоў, праект жыллёвага кодэкса, які плануецца ўнесці на разгляд дэпутатаў парламента на вясенняй сесіі, прадугледжвае такую меру да даўжнікоў за камунальныя паслугі, як перасяленне ў малакамфортнае жыллё. Згодна з данымі міністра, па 8 працэнтах асабовых рахункаў у Беларусі ёсць запазычанасць перад камунальшчыкамі больш за два месяцы, пры гэтым адна чацвёртая — гэта хранічныя неплацельшчыкі.

$9200 — ЧАСТКА ЗДАБЫЧЫ ЗЛОДЗЕЯ

Істотную «дзірку» ў бюджэце 54-гадовай мінчанкі «прабіў» невядомы зламыснік, якому ўдалося трапіць у кватэру да пацярпелай у адным з дамоў па вуліцы Мірашнічэнкі.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, крымінальнік скарыстаўся тым, што гаспадыні не было дома з раніцы да вечара: у чужое жыллё ён прашмыгнуў, правярнуўшы стрыжань замка ўваходных дзвярэй. Злачынцу хапіла часу, каб адшукаць месца, дзе жанчына захоўвала грошы: здабычай яго сталі 9200 долараў ЗША, 4 мільёны беларускіх рублёў і 800 еўра.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАКАЖУЦЬ, «ДЗЕ РАКІ ЗІМУЮЦЬ»?

На возеры Спораўскае Бярозаўскага раёна быў затрыманы непрацуючы грамадзянін, які лавіў рыбу і ракаў сеткай.

Пры затрыманні парушальнік спрабаваў выкінуць за борт лодкі прыладу рыбалоўства і ўлоў. Канфіскавана сетка даўжынёй 50 метраў, 250 ракаў і 3 шчупакі, здабытыя ў перыяд забароны на іх лоўлю. Прыродным рэсурсам нанесены ўрон у асабліва буйным памеры — на суму 375 базавых велічынь (а гэта 13 125 000 рублёў). Цяпер праваахоўныя органы разглядаюць пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАСТАЯЛЬЦЫ ЎЧЫНІЛІ ПАЖАР

Адзін з жылых дамоў вёскі Вінін Бярозаўскага раёна дзеці былых гаспадароў здалі будаўнікам новага ветсанутыльзавода. Хату заняла брыгада з шасці чалавек.

А праз дзве гадзіны пасля таго, як кватаранты зранку адбылі на будаўнічую пляцоўку, суседзі заўважылі чорны дым, які паваліў з вокнаў дома. Пажарныя машыны прыбылі на месца здарэння хутка, выратавальнікі затушылі агонь. Але ўнутры памяшкання выгарала амаль ўсё: мэбля, дываны, два тэлевізары, абгарэлі дзверы, столі і сцены, знішчаны ўсе рэлікві, якімі даражылі ў сям'і.

Камісія, што працавала на месцы пажару, вынесла вердыкт: узгаранне адбылося на прычыне непатушанай цыгарэты, якую пастаяльцы неабачліва пакінулі ў пакоі. Цяперашнія гаспадары домаўладання падалі ў суд і спадзяюцца спагнаць урон з віноўнікаў.

Яна СВЕТАВА.

ЗАГІНУЎ ПОЛЬСКІ КІРОЎЦА

У Дубровенскім раёне на аўтадарозе Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі ў выніку дарожна-транспартнага здарэння загінуў вадзіцель — грамадзянін Польшчы.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе УУС Віцебскага аблвыканкама, трагедыя адбылася а другой гадзіне дня ля вёскі Шухаўцы. 34-х гадовы іншаземец раптам выйшаў на праезную частку з-за машыны «Сканія», што стаяла на дарозе, і трапіў пад колы «Рэно». Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў ён загінуў на месцы ДТЗ.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

22.04.2008 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенного: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. участка 0,0595 га. Начальная цена с НДС – 80 000 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

РУП «Кобальт»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР

на закупку следующего оборудования:

1. Станок токарный с ЧПУ, ориентировочной модели 16ГС25ФЗС, с системой ЧПУ Mitsubishi. Количество — 3 шт.
2. Фрезерный обрабатывающий центр, ориентировочной модели FSS400CNC, размер стола 1200х500, 4-координатный — 1 шт.

Дата окончания приема предложений: 25.04.2008 г.
Дата начала тендера: 10.04.2008 г.
Дата завершения тендера: 25.04.2008 г.

По вопросам получения конкурсных документов обращаться по адресу: Минская обл., Логойский р-н, г.п. Плещеницы, пер. Промышленный, 1 и по тел. 8 01774 78 3 65, м. 8 029 776 38 73, ф. 71 2 54. Листопад Леонид Владимирович.

УНП 600095395

Ваеннаслужачым прадастаўлены сацыяльна-прававыя гарантыі

Ваеннаслужачым Беларусі, супрацоўнікам органаў унутраных спраў, фінансавых расследаванняў, па надзвычайных сітуацыях, суддзям і пракурорскім работнікам прадастаўлены некаторыя сацыяльна-прававыя гарантыі. Адпаведны ўказ № 195 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 3 красавіка.

Да гэтых гарантый, у прыватнасці, адносяцца:

праезд і перавозка ўласнай маёмасці пры пераездзе ў іншую мясцовасць у сувязі з пераводам або звальненнем з ваеннай службы ў запас (адстаўку) за кошт сродкаў дзяржаўнага органа, у якім прадугледжана ваенная служба;

бясплатны праезд адзін раз у год чыгуначным, паветраным і аўтамабільным транспартам да месца жыхарства і назад для ваеннаслужачых, якія займаюць пасады ў міжнародных арганізацыях, што знаходзяцца за мяжой, членаў іх сем'яў, курсантаў і слухачоў, якія праходзяць навучанне за мяжой па накіраванні дзяржаўных органаў;

кампенсацыя расходаў па найму (паднайму) жылля (для ваеннаслужачых і пракурорскіх работнікаў);

права членаў сям'і ваеннаслужачага, суддзі, пракурорскага работніка, які загінуў (памёр) пры выкананні абавязкаў, на атрыманне па дагавору найму на працягу 6 месяцаў жылля дзяржаўнага жыллёвага фонду або 100-працэнтнай бязвыплатнай субсідыі на куплю жылых памяшканняў;

атрыманне адраснай матэрыяльнай дапамогі на праезд курсантамі ваенных навучальных устаноў у такім жа парадку, што і студэнты, вучні, — па рашэнні кіраўнікоў ваенных навучальных устаноў;

забеспячэнне асобных катэгорый ваеннаслужачых для выканання службовых абавязкаў праязнымі дакументамі (білетамі), якія набываюцца за кошт сродкаў адпаведных дзяржаўных органаў;

бясплатнае лекавае забеспячэнне ваеннаслужачых, якія атрымалі раненне (траўму) пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, пры амбулаторным лячэнні.

Указ прадугледжвае магчымасць бязвыплатна атрымаць ва ўласнасць дзяржаўнае жыллё (за выключэннем сацыяльнага, службовага, спецыяльнага жылля, жылля ў інтэрнатах), у якім ваеннаслужачы, суддзя або пракурорскі работнік пражываў да ўступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Беларусі ад 29 лістапада 2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў». Гэтым правам змогуць скарыстацца толькі адзін раз і толькі тыя з названых катэгорый асобаў, хто мае 20 і больш гадоў выслугі на ваеннай службе (стажу работы на адпаведных пасадах, без уліку часу навучання).

Указ замацоўвае права ваеннаслужачых пры наяўнасці пэўных умоў атрымаць ільготныя крэдыты для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылля, незалежна ад аднясення іх да катэгорыі малазабяспечаных грамадзян. Скарыстацца гэтым правам змогуць толькі ваеннаслужачыя ў воінскім (спецыяльным) званні да палкоўніка, якія маюць выслугу на ваеннай службе не менш як 5 каляндарных гадоў (не лічачы перыядаў навучання), стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і толькі аднаразова. Пры гэтым крэдыты будуць прадастаўляцца на агульных правілах, у залежнасці ад таго, дзе ваеннаслужачыя будуюць (набываюць) жыллё — у буйных або малых населеных пунктах.

Суддзям і пракурорскім работнікам прадастаўлена права на пазачарговае будаўніцтва жылля і атрыманне льготных крэдытаў на агульнаўстаноўленых умовах.

У цэлым указ змяшчае збалансаваны аб'ём сацыяльна-прававых гарантый, якія прадастаўляюцца ваеннаслужачым, суддзям і пракурорскім работнікам, прызначаны кампенсаваць спецыфічныя асаблівасці праходжання службы.

Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання. Усе іншыя ўказы, якія замацоўваюць ільготы для ваеннаслужачых, прызнаны страціўшымі сілу.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прамая лінія

Адрас дапамогі. Усім або нямногім?

На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — начальнік управлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Валянціна Пятроўна СЯРГЕЕВА і начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Іван Пятровіч НАГІБІН.

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 3 і 4 красавіка.)

☎ — Я адна выхоўваю дзіця і атрымліваю на яго бясплатнае харчаванне. Ці магу я адначасова разлічваць і на адрасную сацыяльную дапамогу?

Таццяна Міхайлаўна ВАЗНЯК, *г. Маладзечна*

— Асноўны крытэрый для вызначэння права на штомесячную адрасную сацыяльную дапамогу — узровень даходаў менш за бюджэт пражытковага мінімуму на чалавека. Сёння БПМ складае 200 080 рублёў. Адпаведна, даход сям'і з 2 чалавек за тры папярэднія месяцы перад зваротам па адрасную падтрымку не павінен перавышаць адзнаку ў 400 160 рублёў. Прычым, паколькі цяпер вы не працуеце, у склад даходу павінны ўключацца дзіцячая дапамога і кошт бясплатнага харчавання на дзіця ва ўзросце да 2 гадоў.

☎ — Мая жонка з'яўляецца інвалідам I групы, дзеці — школьнікамі, а я атрымліваю дапамогу па доглядзе жонкі-інваліда. Чаму нашай сям'і адмовілі ў прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі?

Міхаіл Міхайлавіч МАЦУКЕВІЧ, *Ганцавіцкі раён*

— Таму, Міхаіл Міхайлавіч, што вы парушылі заканадаўства і да таго ж падчас звароту па адрасную сацыяльную дапамогу не назвалі ўсе крыніцы сваіх даходаў. Варта нагадаць, што асобы ў працаздольным узросце, якім прызначаецца дапамога на догляд інваліда I групы або грамадзяніна ва ўзросце звыш 80 гадоў, не павінны працаваць ці займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. У той жа час з 24 кастрычніка 2007 года па 1 сакавіка 2008 года вы, адначасова з атрыманнем дапамогі на догляд жонкі-інваліда I групы, працавалі ветэрынарам у сельгаскааператыве «Цельшына» і не паведамілі аб гэтым факце. І, да слова, звесткі аб работе ў гэты час ветэрынарам пацвярджаюцца выплатай узносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

☎ — Ці маюць якія-небудзь ільготы адзінокія пенсіянеры, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту? І чаму знялі скідкі па леках для інвалідаў III групы?

Пётр ЛАГОЙСА, *г. Мінск*

— Большасці ранейшых ільгот для пенсіянераў ва ўзросце больш за 70 гадоў цяпер няма, як, дарэчы, не засталося і ранейшых скідак па леках для інвалідаў III групы. Разам з тым трэба заўважыць: незалежна ад групы інваліднасці грамадзяне могуць разлічваць на дапамогу ў набыцці неабходных лекаў пры наяўнасці пэўных захворванняў. Прычым непасрэдна пералік такіх захворванняў вам падкажуць у паліклініцы па месцы жыхарства.

☎ — Я з'яўляюся ветэранам працы і інвалідам II групы. Ці павінны мне аказвацца бясплатна паслугі сацыяльнага работніка дома з улікам таго, што я не маю працаздольных сваякоў у Беларусі?

Ганна Пятроўна, *г. Гродна*

— На бясплатнае надомнае абслугоўванне прымаюцца толькі пенсіянеры і інваліды I і II груп, якія ўвогуле не маюць працаздольных сваякоў або не маюць працаздольных сваякоў на тэрыторыі Беларусі. І пры гэтым такія пенсіянеры ці інваліды павінны быць малазабяспечанымі — інакш кажучы, атрымліваць пенсію, меншую за бюджэт пражытковага мінімуму. Такі парадак агульны. Праўда, з улікам усіх акалічнасцяў і пасапраўднаму цяжкай сітуацыі, у гэтым правіле могуць быць зроблены выключэнні непасрэдна на мясцовым узроўні.

☎ — Мы падалі дакументы на адрасную сацыяльную дапамогу ў студзені і ў тым жа месяцы пачалі атрымліваць выплаты. Аднак, паколькі вядома, з лютага ў Беларусі зменіўся памер бюджэту пражытковага мінімуму. Чаму ў сувязі з гэтым не зроблены перараслік памеру адраснай падтрымкі?

Святлана Дзмітрыеўна ЯРМОЛІК, *Петрыкаўскі раён*

— Памылкі тут няма. Пры вызначэнні памеру адраснай сацыяльнай дапамогі ўлічваецца бюджэт пражытковага мінімуму, які дзейнічаў на дату звароту. І ніякіх перараслікаў потым ужо не робіцца.

☎ — У сувязі з перарэгістрацыяй я, як індывідуальны прадпрымальнік, звольніла сваю работніцу. Пасля гэта дзяўчына звярнулася па адрасную сацыяльную дапамогу. Прычым 180 тысяч дапамогі ёй прызначылі, але толькі на месяц. Ці правільна гэта?

Святлана Вітальеўна КОРСАК, *г. Нясвіж*

— З улікам вывучэння канкрэтнай сітуацыі прызначыць дзяржаўную адрасную дапамогу толькі на месяц сапраўды могуць. Пры гэтым, паколькі ваша былая работніца знаходзіцца ў працаздольным узросце, яна павінна паспрабаваць вырашыць свае цяперашнія матэрыяльныя праблемы самастойна — інакш кажучы, уладкавацца на работу. І толькі калі па аб'ектыўных прычынах уладкавацца не атрымаецца, яна зноў зможа разлічваць на адрасную падтрымку. Прычым для атрымання такой падтрымкі неабходна знаходзіцца на ўліку ў якасці беспрацоўнай.

☎ — Мая знаёмая, якая з'яўляецца маці-адзіночкай, прапісана ў інтэрнаце, але на самай справе здымае кватэру. Ці можа знаёмая разлічваць на адрасную дапамогу?

Людміла, *Салігорскі раён*

— Калі знаёмая мае магчымасці здымаць кватэру, то права на адрасную сацыяльную дапамогу ў яе, хутчэй за ўсё, не будзе. Зрэшты, канчатковае рашэнне на гэты конт павінна прыняць камісія па аказанні адраснай сацыяльнай дапамогі вашага раёна.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.

Спорт-тайм

«ДРАКОНЫ» ПАКАЗАЛІ «ЗУБЫ»

Хакеісты мінскага «Керамін» нарэшце пазбавіліся ад рэпутацыі вечна другіх

Сталічны «Керамін» стаў чэмпіёнам Беларусі ў экстралізе. Да залатых узнагарод мінчан прывёў Андрэй Гусаў, былы нападаючы «драконаў». У фінальнай серыі да чатырох перамог яго падначаленыя ўпэўнена «разбамбілі» сталічнае «Юнацтва» — 4:0 (2:1, 2:1, 5:1, 2:1), прычым званне чэмпіёнаў краіны керамінаўцы здабылі на пляцоўцы сапернікаў.

У рэгулярным чэмпіянаце «драконы» даказвалі сваё лідарства, але ў фінале і Кубка, і нацыянальнага першынства чатыры разы заставаліся сярэбранымі прызёрамі. Аднак сёлета ўсё ж паказалі «зубы» і паклалі на лапаткі трохразовых чэмпіёнаў Беларусі і эксуладальнікаў Кантынентальнага кубка. «Я ведаў характар «Юнацтва», яе няўступчывасць, — прызнаўся Андрэй Гусаў. — Наша перамога не была лёгкай».

Гэта ўжо другое «золата» ў гісторыі «Кераміна». Упершыню «драконы» сталі наймацнейшымі ў нашай краіне ў 2002-м, калі спаборнічалі ў фінале з магілёўскай камандай «Хімвалакно». У сёлетнім складзе мінскай дружыны гулялі чэмпіёны-2002 абаронца Аляксандр Радзінскі і форварды Яраслаў Чупрыс і Дзмітрый Мялешка.

«ЗЕНІТ» ІДЗЕ ДАЛЕЙ

Піцерскі «Зеніт» практычна вырашыў задачу выхаду ў паўфінал Кубка УЕФА. У першым матчы 1/4 розыгрышу расіяне разгромілі ў гасцях нямецкі «Баер» — 4:1. У іншых сустрэчах зафіксаваны нічыйны вынік: «Баварыя» (Германія) — «Хетафе» (Іспанія) — 1:1, «Рэйнджэрс» (Шатландыя) — «Спортынг» (Партугалія) — 0:0, «Фіярэнціна» (Італія) — ПСВ (Галандыя) — 1:1.

Ірына ПРЫМАК.

ВЯСНА ЎСІХ КОРМІЦЬ

У Мінскай вобласці азімыя культуры перанеслі тры самыя халодныя месяцы вельмі добра.

Паводле слоў намесніка начальніка аддзела земляробства і раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Аляксандра Ліпая, асабліва вылучаецца Старадарожскі раён, дзе ўжо засеяна больш за 40 працэнтаў плошчы.

— Сяўба праводзіцца ў дзве змены, энерганасычанымі трактарамі. Усе гаспадаркі забяспечаны палівам, тэхнікай, механізатары праходзяць медыцынскі агляд, прадугледжана харчаванне, — кажа ён.

У Старадарожскім СВК механізатар Віктар Ласоцкі на сучасным трактары «Фэндт-930» працуе ўжо трэці год. Як лепшаму ў гаспадарцы, яму даверылі гэтую цуда-машыну. У дзень яна можа апрацоўваць да 30—35 гектараў. Як толькі скончыцца сяўба у родным вытворчым сельгаскааператыве, паедзе трактар дапамагаць суседнім гаспадаркам — сродкі за сваю «арэнду» зарабляць. Як адзначае старшыня СВК Віктар Балыка, да 13—15 красавіка сяўба ранніх яравых завершыцца.

— У 6 гадзін раніцы ў нас планёрка, а палове сёмай «Фэндт» ужо выязджае на поле. У абед прывозім гарачае харчаванне. Заканчваем у 19.00, — тлумачыць Віктар Балыка. — Сяўбу забяспечваюць 20 чалавек. За дзень можна зарабіць да 60—70 тысяч. А калі пасяўная завершыцца ў тэрмін, на кожнае звяно, занятае ў ёй, выпішам прэмію ў 2 мільёны рублёў.

Увогуле, матэрыяльнае заахвочванне становіцца галоўным рухавіком сельскай гаспадаркі. Як сведчыць старшыня СВК «Залужжа» Аркадзь Нікановіч, пытанняў і праблем у яго механізатараў па пасяўной няма.

— Кожны дзень мы прэміруем удзельнікаў пасяўной. Норму выканаў — атрымліваеш дзесяць тысяч і дваццаць кілаграмаў збожжа. Акрамя таго, кожны ведае, што калі засеяў сто гектараў — атрымаў сто тысяч. Людзі стараюцца, не было выпадкаў, каб у нецвярозым стане выходзілі на поле, ці як-небудзь яшчэ парушалі дысцыпліну.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота аўтара.
Старадарожскі раён.

Віктар ЛАСОЦКІ і яго «Фэндт-930» — «адказныя» за сяўбу.

ЗАМЕСТ ЛАСЯ КУПІЎ БЫ ПЯЦЬ КАРОЎ

жыхар вёскі Вулька Целяханская Івацэвіцкага раёна. Ён паставіў пятлю, у якую трапіў лось. Тады браканьер дабіў няшчасную жывёліну, пагрузіў у трактар і завёз дамоў. Але неўзабаве быў затрыманы. Заплаціць за незаконны промысел давядзецца каля сямі мільёнаў рублёў. За гэтыя грошы купіў бы пяць кароў.

Яна СВЕТАВА.

ВАКОЛ САДОЎНІЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ

Праваўсталёўваючыя дакументы на зямельныя ўчасткі дачнікі павінны атрымаць да 8 кастрычніка 2008 года

Паводле даных Дзяржкаммаёмасці, у Беларусі на 1 студзеня 2008 года налічваецца 4820 садоўніцкіх таварыстваў. Колькасць землекарыстальнікаў або сем'яў, якія валодаюць гэтымі ўчасткамі, складае амаль 538 тыс.

Пакуль дачныя клопаты не моцна захапілі, ёсць час паклапаціцца аб дзяржаўнай рэгістрацыі сваіх правоў на зямельныя ўчасткі ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садоўніцкіх таварыстваў». Зрэшты, на гэта адведзена дастаткова часу — больш як паўгода. Аднак лепш гэту справу не адкладаць на апошнія дні. Аб гэтым у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА расказала **кансультант аддзела нарматыўна-прававога рэгулявання ў эканамічнай сферы юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства эканомікі Антаніна БАДЗІЛОЎСКАЯ.**

— Якія дакументы ў адпаведнасці з новым указам павінны цяпер атрымаць дачнікі, якія з'яўляюцца членамі садоўніцкіх таварыстваў?

— Грамадзяне, якія маюць зямельныя ўчасткі ў таварыстве, незалежна ад таго, ці былі яны прадастаўлены ім для вядзення калектыўнага садоўніцтва або набыты ў далейшым, і якія не з'яўляюцца членамі таварыства і (або) не зарэгістравалі свае правы на гэтыя зямельныя ўчасткі, у двухмесячны тэрмін з дня ўступлення ў сілу ўказа (да 8 кастрычніка) абавязаны афарміць ва ўстаноўленым парадку свае правы на зямельныя ўчасткі і стаць членамі гэтага таварыства.

Аднак неабавязкова чакаць да жніўня, пакуль указ уступіць у сілу, гэта можна зрабіць і цяпер. Уладальнікі павінны засведчыць сваё права на зямельныя ўчасткі. Тыя, хто не мае такіх дакументаў, абавязаны звярнуцца ў райвыканкамы і зарэгістраваць там сваё права на ўчастак. Гэта не зойме шмат часу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Сярод членаў таварыстваў ужо з'явіліся чуткі, што калі яны не зарэгіструюць свае ўчасткі ў тэрмін, то іх адбяруць...

— Да кастрычніка яшчэ ёсць шмат часу. Вядома, цягнуць з гэтай працэдурай не трэба. Але для адабрання ўчасткаў неабходна мець вельмі шмат падстаў. Так, невыкананне патрабавання па рэгістрацыі з'яўляецца падставай для адабрання зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель. Але магчымасць адабрання ўчастка дапушчальная толькі ў судовым парадку. Напрыклад, калі ўчастак закінуты або доўгі час не апрацоўваецца. Парадак на ўчастку павінен быць. Хоць у чалавека могуць быць розныя ўважлівыя прычыны, напрыклад, хвароба, усё гэта таксама ўлічваецца. Калі зямля не будзе апрацоўвацца на працягу года, то аб гэтым паведамляецца ў выканкам. Высвятляюцца прычыны, чаму ўчастак недагледжаны. Спачатку гаспадара папярэджваюць аб адказнасці за гэта. І калі ўбачаць, што ён проста махнуў на гэта рукой, то толькі тады выканкам звяртаецца ў суд, дзе высвятляецца прычына, і толькі пасля гэтага можа быць вынесена рашэнне аб адабранні такога зямельнага ўчастка.

— Калі грамадзянін купіў зямельны ўчастак у садоўніцкім таварыстве, як яму стаць членам гэтай арганізацыі?

— Асаблівасць садоўніцкіх таварыстваў у адпаведнасці з указам заключаецца ў тым, што ў нас няма прыёму ў гэтыя арганізацыі. Членамі таварыства становяцца аўтаматычна, без прыёму ў гэту арганізацыю. З моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права на зямельны ўчастак ва ўстаноўленым парадку, хоча грамадзянін гэтага ці не, ён становіцца членам таварыства. І ён абавязаны плаціць узносы і выконваць усе патрабаванні. Тое ж самае датычыцца і спадчыннікаў. Атрымаў участак у спадчыну, афарміў яго — ён твой. І ты таксама член садоўніцкага таварыства. Не набыў ва ўстаноўленым парадку зямельны ўчастак — даецца год на тое, каб прыняць рашэнне: або афарміць землю або прадаць (перадаць) яе іншай асобе. Гэта значыць, на працягу года грамадзянін павінен распарадзіцца гэтым зямельным участкам.

Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.

Устанаўленне фіксаваных цэнаў на рыэлтарскія паслугі не выкліча заніжэння кошту аб'ектаў, якія прадаюцца

Аб гэтым заявіў намеснік міністра юстыцыі Беларусі Аляксандр Білейчык.

Пастановай урада № 386 ад 14 сакавіка 2008 года ў Беларусі ўстаноўлены фіксаваныя працэнтныя стаўкі і тарыфы на аказанне рыэлтарскіх паслуг — ад 1 працэнта да 3 працэнтаў ад кошту аб'екта, які прадаецца. Раней кіраўнікі рыэлтарскіх арганізацый самі зацвярджалі тарыфы.

Як адзначыў Аляксандр Білейчык, цяпер некаторыя нядобрасумленныя рыэлтары ўводзяць у зман людзей, гаворачы аб быццам бы залішне завышаным кошце рыэлтарскіх паслуг з 1 красавіка гэтага года. «Абвінавачваючы Мінюст у завышэнні цэнаў на рыэлтарскія паслугі, агенты прапануюць грамадзянам скасаваць раней заключаны дагавор і аплаціць паслугі, якія аказваюцца, значна танней, не афармляючы здзелку праз рыэлтарскую арганізацыю», — сказаў намеснік міністра, падкрэсліўшы, што такія факты будуць жорстка выкараняцца.

Устаноўлена, што рэальны кошт здзелкі куплі-продажу аб'екта нерухомай маёмасці складае цяпер для грамадзян амаль $2 тыс.

БЕЛТА.

«ТЫДЗЕНЬ ЛЕСУ-2008»

30 мільёнаў дрэў для будучых пакаленняў плануецца высадзіць у рамках акцыі «Тыдзень лесу-2008», якая пройдзе ў краіне па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі з 7 па 12 красавіка.

Сёлетняя акцыя стане лагічным працягам мінулагодняга пачынання — Дня лесу, калі з удзелам 35 тысяч жыхароў Беларусі было высаджана больш за 12 мільёнаў дрэў на плошчы больш за 2,5 тысячы гектараў. Тыдзень лесу паслужыць таксама ўкладам нашай краіны ў Агульнаеўрапейскі Лясны тыдзень.

Удзел у добраахвотнай рэспубліканскай акцыі зможа прыняць любы грамадзянін краіны. Пералік лясных аб'ектаў, дзе будуць арганізаваны мерапрыемствы акцыі «Тыдзень лесу-2008» размешчаны на афіцыйным сайце Мінлясгаса (www.mlh.by). Кожны ахвотны можа выбраць для сябе аб'ект, на якім бы ён хацеў пасадзіць дрэвы, зарэгістравацца і выехаць туды ў любы дзень акцыі (даведкі можна атрымаць па тэлефонах 220 42 42, 224 61 30, 226 39 59). Спецыяльна для ўдзельнікаў акцыі з 7 па 12 красавіка запланаваны экскурсіі ў лясныя гадавальнікі і паляўнічыя базы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

■ МНС Беларусі самалётам Іл-76 авіякампаніі «Трансавіяэкспарт» даставіла гуманітарны груз у Таджыкістан. Пасля разгрузкі паветранае судна вернецца ў Мінск, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар МНС Беларусі Віталь Навіцкі. Ён таксама нагадаў, што па ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы была прынята адпаведная пастанова ўрада па запыту, з якім звярнуўся генеральны сакратар ЕўрАзЭС Таір Мансураў у сувязі з крытычнай сітуацыяй, што склалася ў Таджыкістане з-за анамальна халоднага надвор'я. У склад гуманітарнага грузу ўваходзяць дзве дызельныя электрастанцыі, 5 тыс. коўдраў, 10 тыс. бляшанак кансерваў. Гэта не першая такая акцыя. Так, апошні раз дапамога Таджыкістану была аказана ў 1999 годзе. А ўсяго рэспубліка, у тым ліку непасрэдна МНС, удзельнічала ў такіх акцыях 21 раз. Дапамога аказана 17 краінам свету.

■ Брэсцкі лясгас прыступіў да пасадак сасны сібірскай кедравай, або кедра. Цяперашняя вясной на плошчы 1 га будзе высаджана каля 2 тыс. двухгадовых саджанцаў. Лясгас выгадаваў іх самастойна, закупіўшы два гады таму ў Омскай вобласці кедравыя арэхі. За гэты час сеянцы значна падраслі і з гадавальніка будуць высаджаныя на сталае месца.

■ Пры правядзенні работ па ўсталёўцы пральнай машыны работнік, запрошаны гаспадыняй віцебскай кватэры, натыкнуўся на нябачную перашкоду ў сцяне паміж ванным пакоем і кухняй, дзе праходзяць трубы каналізацыі. Мужчына паспрабаваў расчысціць праход для шлангаў бытавога прыбора і выцягнуў з тэхналагічнай адтуліны ржавы прадмет. Ім аказаўся мінамётны снарад калібра 50 мм часоў Вялікай Айчыннай вайны. Як растлумачыла праваахоўнікам жанчына, сям'я не рабіла рамонту ў кватэры з моманту засялення. Якім чынам «рарытэтны» боепрыпас апынуўся ў памяшканні, яна нават не ўяўляе. Падчас працы па размінаванні прыйшлося эвакуяваць суседзяў з кватэр трох пад'ездаў пяціпавярховага дома.

■ Беларуская міліцыя адмовілася ад страявых коней на карысць веласіпедаў і скутараў. Раней у склад мінскай міліцыі ўваходзіў кавалерыйскі ўзвод, які ахоўваў парк Чалюскінцаў, Мінскае мора і іншыя зоны адпачынку. Як прагучала на прэс-канферэнцыі ў Мінску, у цяперашні час засталося толькі два кані, бо ўтрымліваць спецыяльны ўзвод і коней аказалася складана і эканамічна нявыгадна. Узамен будуць набытыя веласіпеды і скутары.

■ Былы генерал харвацкай арміі Іван Карада, якога падазраваліў некалькіх забойствах, застрэліўся пры затрыманні. Харвацкія паліцэйскія паспрабавалі затрымаць беглага генерала ў асабняку, дзе ён хаваўся, але генерал адкрыў агонь, у перастрэлцы загінуў супрацоўнік паліцыі, пасля чаго генерал застрэліўся. Яму было 43 гады, ён падазраваўся ў забойстве свайго памочніка і траіх цывільных.

■ Заканадаўцы амерыканскага штата Арканзас у канцы мінулага года выявілі, што закон, у якім яны мелі намер устанавіць мінімальны ўзрост для ўступлення ў шлюб, у сапраўднасці наогул не меў ніякіх узроставых абмежаванняў. Як аказалася, у тэксце закона было ўпушчана адно-адзінае слова «не», што поўнасцю мяняла сэнс дакумента. У ім гаварылася, што «чалавек маладзейшы за 18 гадоў мае права заключыць шлюб са згоды бацькоў», г.зн. ён распаўсюджваўся і на немаўлят. Заканадаўцы былі вымушаныя як можна хутчэй склікаць спецыяльную сесію для перагляду закона. На гэтым тыдні ў дакумент былі ўнесены папраўкі, якія дазваляюць уступаць у шлюб мужчынам не маладзейшым за 17 гадоў і жанчынам не маладзейшым за 16.

■ Працаваць за мяжу летась паехалі 2,4 тыс. мінчан. Гэта тыя грамадзяне, якія заключылі дагаворы з замежнымі наймальнікамі. Працаваць у сталіцу прыехалі 600 замежнікаў, сярод іх кіраўнікі прадпрыемстваў, спартсмены, кухары, будаўнікі. Асноўнымі краінамі-пастаўшчыкамі працоўнай сілы з'яўляюцца Турцыя, В'етнам, Украіна, Кітай. Нашы суайчыннікі часцей за ўсё выбіраюць для працы Расію (будаўніцтва), Украіну і краіны Балтыі (у якасці вадзіцеляў).

■ Незалежны член аўстралійскага парламента Эн Брэсінгтан заклікала мужчын складаць спецыяльнае пагадненне на сэкс з жанчынамі, каб абараніць сябе ад абвінавачванняў у згвалтаванні. Гэтую заяву парламентарый зрабіла ў знак пратэсту супраць паправак у законы, якія датычацца пакарання за згвалтаванне. Паводле прапанаваных змен, злачынствам можа лічыцца нават сэкс па згодзе, калі жанчына пасля палавога акту раптам палічыла, што гэта было згвалтаванне. Пазней Брэсінгтан растлумачыла, што не казала сур'ёзна, калі ўносіла падобную прапанову, аднак дадала, што гэта сапраўды адзіны спосаб абараніць мужчын. «Складаць дамову на сэкс — ідыятызм, аднак прымаць законы, якія не абараняюць правы мужчын — не меншы ідыятызм», — заявіла яна.

■ У амерыканскім горадзе Уоран у штаце Мічыган у адзін з банкаў увайшла жанчына ў парыку і запоўніла анкету на адкрыццё рахунку. Потым яна дастала пісталет і запатрабавала ў касіра грошы. Аднак яе план па рабаванні банка праваліўся, і жанчына ўцякла без грошай. Пры гэтым яна пакінула на месцы злачынства анкету са сваім адрасам і фатаграфіяй. Праз гадзіну гора-рабаўніца была ўжо пад арыштам.

■ 50-гадовая Маркета Вахава з чэшскага горада Цешын змагла ўгаварыць злодзея адмовіцца ад рабавання і як-небудзь пагутарыць за кубкам гарбаты аб яго праблемах. Яна спытала злачынцу, навошта ён вырашыў абрабаваць магазін, і паступова паміж ёй і рабаўніком завязалася размова. У рэшце рэшт рабаўнік папрасіў прабачэння і згадзіўся папіць гарбаты з Вахавай. Паліцыя горада вядзе пошук «мілага маладога чалавека», які хацеў абрабаваць магазін. Аматару гарбаты пагражае да 10 гадоў турмы.

■ У в. Селяхі, што пад Брэстам, аператыўнікі затрымалі «Рэно», у якім было 58 рулонаў імпартнай тканіны, а калі зазірнулі ў хлеў да 17-гадовага жыхара гэтай жа вёскі, то знайшлі там яшчэ 55 рулонаў такой жа тканіны. Тавару канфіскавана на 40 млн рублёў.

■ Колькасць разводаў у Беларусі павялічваецца і ў гэтым годзе: з 5 тыс. 660 за студзень—люты 2007 года да 5 тыс. 741 за студзень—люты 2008-га (на 1,4 працэнта). Пры гэтым насцярожвае зніжэнне колькасці шлюбаў, якія заключаюцца. Так, за два месяцы мінулага года зарэгістравана 10 тыс. 152 шлюбы, за два месяцы гэтага года — 8 тыс. 836.

Поўны абзац

■ Эмі Райс з амерыканскага штата Мінесота пакусала пітбуля, які напаў на яе сабачку. Паводле слоў жанчыны, пітбуль пераскочыў праз агароджу і напаў на лабрадора-рэтрывера па мянушцы Эла. Райс баялася, што байцоўскі сабака заб'е яе любімiцу, і таму накінулася на пітбуля і ўкусіла яго за нос. Падчас укусу ёй у рот трапіла кроў ахвяры, і таму жанчыне, магчыма, давядзецца рабіць прышчэпкі ад шаленства. Пітбуля накіравалі на каранцін, а лабрадор Эла абышоўся пакусанай галавой і парваным вухам.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Планета жывёл

Чатырохногія вартавыя, выратавальнікі і ...лекары

Сабака — не толькі сябар і надзейны памочнік чалавека, але і ...сапраўдны лекар.

Як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі начальнік пошукава-выратавальнай кіналагічнай службы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Ігар Кракоўскі, лабрадоры з МНС прымаюць актыўны ўдзел у лячэнні дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнай сістэмы. Спецыяльная праграма «догатэрапія» ажыццяўляецца ў нашай краіне ўжо 1,5 года. Увесь гэты час 2 разы на тыдзень чатырохногія лекары наведваюць Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў і дапамагаюць маленькім пацыентам змагацца з хваробамі. Адметна, што на сеансы «догатэрапіі» сабакі прыязджаюць у поўнай баявой гатоўнасці. «Гэта на той выпадак, калі раптам дзесьці ўзнікне надзвычайнае здарэнне і тэрмінова спатрэбяцца чатырохногія выратавальнікі», — патлумачыў Ігар Кракоўскі. Дзякаваць Богу, падобных выпадкаў у нашай краіне апошнім часам не было. Але, тым не менш, служба ў сабак-выратавальнікаў даволі напружаная, праходзіць у пастаянных трэніроўках. Лабрадоры з МНС нават асвойваюць прафесію «альпініста»: з вышыні 40 метраў іх на спецыяльных прыладах дэсантуюць з верталёта на зямлю разам з адмысловай экіпіроўкай скалалазаў. Не менш смелыя і сабакі, якія служаць у міліцыі, а таксама ў памежнай варце. Напрыклад, як паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Віктар Лебедзеў, з дапамогай чатырохногіх памочнікаў міліцыянеры гэтага падраздзялення сёлета раскрылі амаль 150 злачынстваў. У сярэднім, менавіта сабакі затрымліваюць кожнага дзесятага злачынцу. Напрыклад, нядаўна з дапамогай аўчаркі ў Светлагорскім раёне былі злоўлены ліхадзеі, на рахунку якіх серыя цяжкіх злачынстваў, у тым ліку і забойства. Пільна нясуць службу і чатырохногія вартавыя мяжы. Паводле слоў начальніка кіналагічнай службы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Уладзіміра Ворніка, за мінулы год сабакі затрымалі каля 200 парушальнікаў мяжы і выявілі 92 кантрабандныя грузы агульным коштам 960 мільёнаў рублёў.

Дарэчы, адказваючы на пытанне «Звязды», Уладзімір Ворнік паведаміў, што памежнікі-кінолагі маглі б наладзіць і падрыхтоўку сабак-павадыроў для сляпых людзей. Патрэба ў такіх сабаках вельмі вялікая. Але гэта, як падкрэсліў Уладзімір Ворнік, вельмі карпатлівая праца, бо толькі адзін са ста сабак можа стаць павадыром. А ў памежнікаў не хапае ні сілаў, ні сродкаў, каб займацца навучаннем такіх сабак. Увогуле, прадстаўнікі кіналагічных службаў МУС, МНС і Дзяржаўнага пагранічнага камітэта лічаць, што для падрыхтоўкі сабак-павадыроў патрэбна спецыяльная дзяржпраграма.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Предложение о покупке простых (обыкновенных) акций Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк»

Наименование, местонахождение покупателя акций	Совместное общество с ограниченной ответственностью «Валимед», 220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а, комн. 11
Наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются	Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк», 220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а
Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции	20,88 (Двадцать целых восемьдесят восемь сотых) белорусского рубля
Сроки, форма и порядок оплаты акций	Оплата будет осуществляться в безналичной форме путем перечисления денежных средств на счет продавца в срок до 09 июня 2008 г. с момента вступления договора купли-продажи акций в силу
Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций	220012, г. Минск, проспект Независимости, 87а
Даты начала и окончания покупки акций	Дата начала покупки акций – 08.04.2008 г. Дата окончания покупки акций – 18.04.2008 г.

Телефон для справок (017) 287 38 45

УНП 800005506

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
Открытого акционерного общества
«Универсам Фрунзенский» за 2007 г.

| АКТИВ | Код строки | на конец отчетного года млн. руб |
|

СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



В	Е	К	Р	Ь	У	Г	Ы	Ч	С	Т
Р	Т	С	О	Н	Н	К	А	Ж	У	А
А	П	Л	Р	А	П	Р	Ы	Г	Р	Т
З	Ь	О	Э	Н	Б	Д	Й	В	А	А
А	Ч	Ш	А	Ч	У	Г	А	Я	Л	К
С	Т	У	П	Л	М	А	Р	Л	Я	К
У	Б	Ж	Т	Ы	О	Н	К	Р	У	Б
Л	Н	К	А	Б	О	А	У	А	К	П
Ь	А	Р	Ы	С	Т	К	Р	О	П	А
Б	Р	О	Н	К	А	Р	А	Д	Е	Р
А	Г	П	А	Д	М	У	К	Ы	М	А

ЛАБІРЫНТ. У гэтым своеасаблівым россыпу літар адшукайце словы-адказы. Гэта — пераклады некалькіх слоў на беларускую мову. Літары адна за адной могуць звязвацца ў словы па гарызанталях (злева направа і справа налева), па вертыкалях (зверху ўніз і знізу ўверх), але не па дыяганалях. Аматарам падобных галавалом гэтыя правілы добра знаёмыя. Адшукайце гэтыя пераклады ў россыпу літар. Адно слова ў якасці прыкладу мы пазначылі.

Вось тыя словы, пераклады якіх вам трэба адшукаць:

1. Парус. 2. Висок. 3. Железная дорога. 4. Стадо. 5. Овсяный кисель. 6. Площадь. 7. Поручень. 8. Трясина. 9. Выпь. 10. Плот. 11. Козодой. 12. Ромашка. 13. Лента. 14. Картофель. 15. Бумага. 16. Свёкла. 17. Копоть. 18. Гроздь. 19. Очерк. 20. Сапог. 21. Фундамент.

Адказы на іспанскую крыжаванку, апублікаваную 1красавіка.

У	Р	А	Н	•	Ш	А	М	П	У	Р
К	А	Т	А	Л	О	Г	•	А	Р	А
А	Т	А	Р	А	•	Р	■	Г	А	К
З	А	М	А	К	•	А	Р	А	Л	•
•	Т	•	Д	■	Ш	Н	У	Р	•	■
М	А	К	•	М	У	К	Д	Э	Н	•
А	Р	А	Б	•	Г	А	А	Л	Я	Н
Р	■	Р	У	Б	А	•	•	Е	В	А
Ш	Ч	А	Р	А	•	Л	А	Ц	Ы	О
				Н	Е	О	Н	■	Г	■
				Д	■	Б	А	Б	А	•
				Ж	А	Н	Г	А	Д	А
				А	■	Я	Р	К	А	■

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД 2 КРАСАВІКА.

Па гарызанталі: Навальніца. Рарог. Лапа. Іней. Спас. Ямб. Папа. Сайт. Дан. Опера. Докшыцы. Бар. Піка. Аніс. База. Дантэс. Капеж. Клімат. Кода. Акруга. Віно. Лаз. Зварот. Лато. Компас. Перу. Драч. Паводка.

Па вертыкалі: Лістапад. Закон. Спёка. Зад. Апал. Дыба. Арык. Праца. Джаз. Нара. Нырка. Лямпа. Апіс. Норка. Печ. Варан. Твар. Ежа. Суп. Гай. Сказ. Стос. Паліва. Ясенін. Мір. Кімано. Граб. «Атас». Тот.

ДЗЕНЬ БАЦЬКІ

У Магілёўскай вобласці імкнуцца ўзняць аўтарытэт бацькі ў сям'і

Павел Міхайлавіч ГАРМАШ — адзінокі шматдзетны бацька з Бабруйска. Ён выхоўвае траіх дзяцей, старэйшаму з якіх толькі 11 гадоў.

— Пачастуйцеся маім бартшчом, — запрашае гаспадар. — Ці смачна? Гэта любімая ежа маёй дачкі.

Валеры — яна малодшая ў сям'і — толькі 6 гадоў. Тры вясёлыя «хвосцікі» ўпрыгожваюць прыческу маленькай прыгажуні. А бацька жартам называе яе сваім хвосцікам: ходзіць за ім, чакае з паездак і абяцае ніколі не пакінуць яго. «Я татку люблю, за ўсё!» — кажа малая.

Сам бацька, калі шчыра, яшчэ не ачуўся пасля разрыву з жонкай: яны разам пражылі дзесятак гадоў, выглядалі ўзорнай сям'ёй, але аднойчы ў няпростай сітуацыі жанчына рассталася з мужам і дзецьмі. Суд пакінуў малых разам з Паўлам, і яны жывуць няпоўнай сям'ёй ужо паўтара года.

— Для мяне толькі цяпер смак жыцця адкрыўся, смак бацькоўства, — гаворыць Павел. — Не тое, што бацька з працы дадому прыйшоў, піва выпіў, ногі на стол і ўтаропіцца ў тэлевізар. Трэба даглядаць і выхоўваць сваіх дзяцей.

А боршч і сапраўды смачны. Мужчына з лёгкасцю гатуе любімыя стравы сваёй сям'і: аліўе, селядзец «пад шубай», галубцы і бульбяное пюрэ. Ён кансервуе гародніну, выціскае сок і доіць коз.

— Мне падаецца, якая з гэтым праблема? — здзіўляецца пахвальным словам мужчына. — Калі не ведаеш, як рабіць, можна патэлефанаваць сябрам альбо пачытаць у кніжцы. Мы з дзецьмі ніколі галадаць не будзем. Мая маці дапамагае, чым можа. У мяне ёсць дом, праца, аўтамабіль і мае рабочыя рукі. Выжывем!

Праўда, сам Павел большае значэнне надае не матэрыяльнаму забеспячэнню, а душэўным зносінам у сям'і.

— Я думаю, што самая галоўная роля бацькі ў тым, каб паказваць на сваім прыкладзе, што такое сапраўдныя жыццёвыя каштоўнасці, — мяркуе ён. — І важна, каб дзеці бачылі, як бацька ўмее перамагаць розныя стрэсы, пераадольваць цяжкасці.

Ён не хавае, як яму было цяжка. Ад нахлёсту эмоцый здавала здароўе. Каб пакінуць убаку праблемы, стаў рабіць рамонт на падворку. І з цягам часу зразумеў, што трэба засяродзіцца не на болю і стратах, а на тым, што ёсць добрае ў жыцці. «Мае дзеці — гэта не цяжар, а радасць», — паўтарае Павел.

Пры гэтым, заўважце, адзінокі бацька зла на былую жонку здолеў не трымаць: малыя вольна ездзяць да маці ў госці, і на веснавыя канікулы да яе паехаў 8-гадовы Жэня. Павел лічыць, што дзяцей нельга вучыць нянавісці.

— Я ўвечары часта распальваю ў дварэ вогнішча і вяду з дзецьмі задушэўныя размовы, — расказвае бацька. — Мы чытаем добрую літаратуру. Размаўляем пра ўсё, у нас няма закрытых, сарамлівых тэмаў. Нават пра сэкс: каб не вуліца выхоўвала, а бацька сфарміраваў стрыжань — разуменне добрага і дрэннага. Я не шкадую на гэта часу.

Няпоўных сем'яў, дзе дзяцей выхоўвае тата, насамрэч не так ужо і мала. У кожнай школе дзесятак знойдзецца. Уяўленне аб ролі бацькі ў звычайнай, нармальнай сям'і з цягам часу ў грамадстве таксама мяняецца.

Яшчэ гадоў пяць таму мужчыны скардзіліся, што начальства на працы ў лепшым выпадку здзіўлена сустракае вестку пра тое, што бацька бярэ лісток непрацаздольнасці па догляду дзіцяці.

— Калі дзіця захварэла і жанчына ідзе на бальнічны, то яна — добрая маці, — разважаў знаёмы бацька. — А калі мужчына робіць гэтак жа сама, то чаму яго лічаць за лайдака?..

Калі настаўнік гісторыі сельскай школы ў Пудаўні Дрыбінскага раёна Ігар Вронскі пайшоў у «дэкрэтны», аднавяскоўцы, можа, і абмяркоўвалі паміж сабой яго нечаканы ўчынак, але ніводнага слова не сказалі ўслых.

— Толькі мужчыны мяне шкадавалі, — узгадвае Ігар Браніслававіч. — Увечары запрашалі выйсці, пасядзець на лаўцы, адпачыць. Што ж, цяжка было насамрэч. У нас з жонкай нарадзіліся дзяўчынкі-двайняты: Каця і Вольга крычалі ледзянамі і пастаянна хварэлі. Я іх карміў і мыў пялюшкі.

На сямейным савеце сужэнцы вырашылі, што выходзіць на працу давядзецца менавіта маці. Таму што Ганна Уладзіміраўна, настаўніца хіміі і біялогіі, атрымлівала большы заробак.

— Хоць мне падаецца, што жонцы ўсё ж было цяжэй чым мне, — цяпер прызнаецца вопытны «дэкрэтнік». — Яна прыходзіла з працы і займалася хатнімі клопатамі. Мы спалі тры-чатыры гадзіны ў суткі, і так доўжылася два гады.

Цяпер, калі дзяўчаткі падраслі, перадавы бацька кажа, што нічога страшнага і сарамлівага ў мужчынскім водпуску па доглядзе дзяцей няма. Бо дзеці — гэта адказнасць не толькі маці, але і бацькі.

— Будучае дзіцяці цалкам залежыць ад атмасферы, якая пануе ў сям'і, — лічыць намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Святлана Ляонава. — І мужчына павінен быць галавой сям'і: абаронцам, апірышчам, падтрымкай, прыкладам свайго дзецям. Мы хочам падняць аўтарытэт бацькі. Паказаць мужчынам, што іх роля ў сям'і — вельмі важная.

У абласным упраўленні адукацыі днямі зацвердзілі «Комплексны план мераў па фарміраванні інстытута бацькоўства як галавы сям'і». У ім — два дзесяткі пунктаў: розныя мерапрыемствы, разлічаныя на тры гады.

Ва ўстановах адукацыі плануецца стварыць саветы бацькаў, гасціныя адзінокіх бацькаў, клубы маладых бацькаў. Будзе арганізавана праца адмысловай інавацыйнай пляцоўкі. Тут яшчэ — стварэнне гурткоў і спартыўных секцый, правядзенне выстаў і конкурсаў. І ў цэнтры ўсяго гэтага — бацька.

Што ж, цяпер у школах большасць педагогаў — жанчыны. Ва ўпраўленні адукацыі мяркуюць, што калі на ролі мужчыны ў сям'і будзе засяроджвацца большая ўвага, то больш маладых людзей захочуць стаць настаўнікамі. І яны будуць уплываць на выхаванне хлопчыкаў у сапраўдных мужчын і бацькаў.

Ёсць у Магілёўскай вобласці школы, якія ўжо цяпер могуць падзяліцца вопытам працы з бацькамі. Напрыклад, школа № 16 горада Бабруйска, дзе нядаўна прайшла канферэнцыя бацькаў.

— Летась у сувязі з ростам правапарушэнняў педсавет школы вырашыў больш працаваць з сям'ёй, — расказвае намеснік дырэктара школы па выхаваўчай працы Раіса Пехцерава. — Але на канферэнцыю бацькоў прыйшлі ў асноўным адны маці. Таму мы вырашылі асобна сабраць мужчын. Іх было цяжка зацягнуць у школу, нават пад ціскам жанчын, але 32 бацькі напрыканцы сакавіка прыйшлі ў школу. Гэта першы крок, таму што ў нашай школе вучацца дзеці з 900 бабруйскіх сем'яў.

Канферэнцыя бацькоў — гэта была не проста лекцыя педагогаў, псіхолагаў і прадстаўнікоў праваахоўных органаў. Напрыклад, анкеты пра аўтарытэт бацькаў запоўнілі дзеці і іх бацькі: аказалася, што мужчыны перавысілі свой аўтарытэт. Бацькі ацанілі яго на 80 працэнтаў, а дзеці — толькі на 50.

Дзеці напісалі сачыненні пра сваіх татаў. Некаторыя дзіцячыя расповеды зачыталі дарослым: і пра вяртанне п'янага бацькі дадому, і пра паходы ў басейн з лепшым у свеце татулем.

— Мы імкнёмся да супрацоўніцтва з бацькамі, — тлумачыць Раіса Пехцерава. — Вырашылі стварыць клуб бацькаў. І на працу да іх адпраўляць не толькі скаргі на дрэнныя паводзіны іх дзяцей, але і ўдзячнасці за іх добрае выхаванне.

Стэрэатып грамадства, што бацька павінен матэрыяльна забяспечыць сям'ю — а пра астатняе выпадае клапаціцца маці, усё яшчэ жыве. Нават нягледзячы на тое, што жанчына нярэдка зарабляе больш за мужчыну.

— Роля маці і бацькі ў выхаванні дзяцей павінна быць роўная, — мяркуе Святлана Ляонава. — Таму што гэта агульнае дзіця. Не прынцыпова, хто колькі зарабляе. А прынцыпова — каб былі нармальныя зносіны ў сям'і і добрыя ўмовы для выхавання дзіцяці. Каб яно было здаровае, шчаслівае і вырашала свае дзіцячыя праблемы з маці і бацькам, як з сябрамі і дарадцамі.

Павел Гармаш абсалютна ўпэўнены, што бацька павінен несці адказнасць за маральнае выхаванне свайго дзіцяці, браць непасрэдны ўдзел у вырашэнні пытанняў, звязаных з навучальным працэсам дзіцяці, а не ўскладаць усё гэта на плечы толькі маці.

— Я з задавальненнем святкаваў бы Дзень бацькі, — прызнаўся Павел. — Чаму ж толькі маці ўшаноўваюць? А таты? А так была б нагода ў Дзень бацькі адзначыць лепшых і на добрым прыкладзе падняць адказнасць за дзяцей у іншых. Будзе здаровы бацька, тады будзе здаровая сям'я, і ўвогуле здаровае грамадства.

Дарэчы, у сёлетнім кастрычніку ўпершыню на Магілёўшчыне пройдзе тыдзень падзякі бацькам.

Ілона ІВАНОВА.

Бабруйск — Дрыбінскі раён — Магілёў.

ПАВЫШАНЫ РОЗНІЧНЫЯ ЦЭНЫ НА АСОБНЫЯ МАРКІ ТЫТУНЁВЫХ ВЫРАБАЎ

З красавіка на Br10—50 за пачку. Па марках цыгарэт, што выпускае ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» — на Br10—30 за 1 пачак, па дзвюх марках цыгарэт, што выпускае ТАА «Тытунь-Інвест», — на Br30—40, па трох назвах тытунёвых вырабаў замежнай вытворчасці — на Br50.

МІНЛЯСГАС НЕ БУДЗЕ ПАВЫШАЦЬ ЦЭНЫ НА ДРАЎНЯНАЕ ПАЛІВА

заявіў міністр лясной гаспадаркі Пётр Сямашка. Цэны будуць індэксавацца толькі з улікам інфляцыі. «Цана на паліўную драўніну, калі насельніцтва самастойна яе нарыхтоўвае, у сярэднім складае Br300 за кубаметр, у залежнасці ад пароды». Калі набываць драўнянае паліва ў арганізацыях гарпаліва, гэта абыдзецца не больш як Br30—33 тыс. за кубаметр пры сабекошце Br30 тыс. за кубаметр.

БЕЛТА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-4

Працягваем гэты конкурс заданнем № 11 — эцюдам Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў) і Уладзіміра Сапяжынскага (Рагачоў):



БЕЛЫЯ: a5, e3, g3, h4 (4). ЧОРНЫЯ: c5, f6, дамка e1 (3). Нічыя.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ЗАРАДЗІМ МАЗГІ

Сёння нам дапаможа заданне № 3 бліцконкурсу-37 — варыяцыя Аляксандра Кіслага (Узда) мініяцюры з конкурсу «Пагода ў доме»-4/4:



БЕЛЫЯ: c5, d2, d6, e1, e3, f4, g3 (7). ЧОРНЫЯ: a3, a7, b2, b4, c3, h2 (6). Выйгрыш.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад нашага шчодрага чытача **Іосіфа Апалінаравіча БУЯКА** (в. Бацяны Воранаўскага раёна).

Па-за конкурсам разгледзьце яшчэ адну канструкцыю Аляксандра Кіслага — яна падобна на заданне № 7 таго ж конкурсу:

БЕЛЫЯ: b4, c5, d4, d6, e7, g5 (6). ЧОРНЫЯ: a3, e3, f2, f8, g7, h2 (6). Перамога белых. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

РАШАЕМ, УНОСІМ КАРЭКТЫВЫ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-4: **№ 7** (М. Наўроцкі). 1. cb6 2. gh6 3. d:b4 4. h:g1 gf2 5. g:c5x; **№ 8** (В. Шульга). hf4 (f2A) a3, b2 (e3) c1 (f2, g3) f4, e3x. A(cd4) d6, h2 (e1) f2, c7x; **№ 9** (В. Еўсюкоў — А. Агеенка). 8. ... fe5 9. fg5 10. e:g5 ef4 11. g:e3 de5. Белыя здаліся. Пабочныя разгалінаванні ў пазіцыях з партый не ўлічваюцца.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (М. Наўроцкі): **№ 1.** 1. ed4 2. c:e3 3. h:d6 4. a:c7 5. gf6x; **№ 2.** 1. fe3 2. gh2 3. d:d8 4. hg3 5. hg7 6. d:b4 7. a:e5x; **№ 3.** 1. bc7 2. de3 3. cb6 4. gh2 5. h:e1x.

НЕ АРТАДАКСАЛЬНАЯ ПАЗІЦЫЯ (Д. Слясарчык): 13. ... 24:35 14. 44-39 15. 28-22 16. 37- 31 17. 38-32 18. 33-2 19. 2:1x.

ЗАРАДЗІМ МАЗГІ: **№ 1** (Л. Вітошкін). 1. ba5 2. a:c3 3. a:c3 ed4 4. c3:e5 5. hg7 6. gf8 de5 7. fg7x.

Рашылі, у тым ліку і пятае—шостае заданні класіфікацыйнага конкурсу «Пагода ў доме»-4: В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), В. Жукоўскі (г. Барань Аршанскага раёна), В. Краўчук (Баранавічы), І. Працук (Паставы), настаўнік А. Т. Янчук і яго вучні Андрэй Раманюк і Віктар Сіўругін (Камянец), К. Козел (в. Лассона Гродзенскага раёна), В. Белы (Калінкавічы), А. Коўган, П. Акуліч, П. Леўчык, А. Мікуліч і К. Найдовіч (Мінскі раён), А. Белы і П. Шклудаў (Наваполацк), В. Ціханенка (Гомель), І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), В. Голас (Любань), А. Агіевіч (Кобрын), Р. Сідарчук і У. Сямашка (Брэст), А. Пераўзнікаў (Рагачоў), А. Кіслы і інш.

Сярод іх Л. Вітошкін (Гомель) і Д. Камчыцкі ў заданні № 5 (аўтар В. Шульга) таксама заўважылі 2. cg1x і зарабілі дадаткова па 0,5 ачка. У задачы У. Рычкі («Звязда», 31 студзеня) У. Сапяжынскі і Д. Камчыцкі ўбачылі 29 (50A) 37/27# і A(11) 7/17#. І. Астроўскі (Мінск), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), А. Еўсееў (Бялынічы), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), С. Нячаеў (Баранавічы), Д. Камчыцкі і У. Сапяжынскі ў заданні № 8 конкурсу «Пагода ў доме»-4 (аўтар В. Шульга) у варыянце A(cd4) даказалі d6/c5/b8/h2x. Ім налічана па 0,5 прэміяльных бала.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Піце малако. Казінае

Вучоныя заўважылі, што больш за ўсё доўгажыхароў у тых месцах, дзе ў штодзённы рацыён уваходзіць казінае малако. Лекавыя ўласцівасці яго пацвярджаюць і дыетолагі, педыятры, прадстаўнікі іншых медыцынскіх прафесій. Да нашых дзён захаваліся рэцэпты лячэння казіным малаком, праверэныя не адным пакаленнем.



ЧЫМ КАРЫСНАЕ КАЗІНАЕ МАЛАКО?

Каштоўнасць гэтага прадукту звязана з тым, што козы харчуюцца лекавымі раслінамі, таму малако мае спецыфічны прысмак. Але ад каровінага яно адрозніваецца яшчэ і тым, што тлушчавыя шарыкі ў ім значна меншыя па памерах, а гэта палягчае працэс ператраўлівання. Менавіта таму казінае малако лепш пераносіцца пры розных парушэннях стрававання. Яшчэ казінае малако карыснае тым, што: паляпшае склад крыві і валодае бактэрыцыднымі ўласцівасцямі; умацоўвае імунітэт; садзейнічае хуткаму зрошчванню касцей пры траўмах за кошт павялічанай колькасці кальцыю; актывізуе работу стрававальных залоз і валодае проціалергічнымі ўласцівасцямі; станоўча ўплывае на стан здароўя пры захворваннях скуры, суставаў і некаторых іншых немачаў. З мэтай лячэння казінае малако дзецям да трох гадоў трэба даваць па 100—150 мл два разы на дзень, дзецям пасля трох гадоў — па 150—200 мл. Дарослым казінае малако можна піць без абмежаванняў.

ХВАРОБЫ СТРАВАВАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ

Ад гастрыту з павышанай кіслотнасцю дапаможа такі рэцэпт: размяшайце ў шклянцы падагрэтага да 30° казінага малака адну чайную лыжку мёду і выпіце за гадзіну да яды. Выпівайце па 2 шк. у дзень на працягу двух месяцаў. Тым, у каго кіслотнасць паніжаная, рэкамендуецца халоднае казінае малако з мёдам, якое лепш прымаць па 0,5 шк. 2—3 разы на дзень за гадзіну да яды. Малако знімае боль і папярэджвае ўзнікненне запораў. Ад язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі можна цалкам вылечыцца, калі штодзённа выпіваць нашча 1 шк. свежага малака і яшчэ па шклянцы — за гадзіну да абеду і вячэры. На працягу двух гадоў пры такім рэжыме язва знікае бясследна.

Пры запаленні падстраўнікавай залозы прыгатуйце сыраквашу звычайным спосабам, а затым з падагрэтай сыраквашы рабіце кампрэсы на вобласць жывата на ноч.

БАЛЬЗАМ ДЛЯ СКУРЫ

Ад псарыязу дапамагае такі рэцэпт. Наліце ў каструлю малако, давядзіце да кіпення, патрымайце на невялікім агні 2—5 хвілін. Цяпер зліце малако ў іншую пасудзіну, а белы налёт, што застаўся на сценках, збярыце і змазвайце ім пашкоджаныя месцы. Для амаладжэння скуры твару ўмывайцеся зранку і ўвечары разбаўленым казіным малаком. Асабліва гэта карысна тым, у каго порыстая скура.

ВАЗЬМІЦЕ НА ЗАМЕТКУ

- Выяўлена, што зацяжная дэпрэсія можа стаць прычынай крохкасці касцей. Асабліва ў жанчын пасля 40 гадоў павялічваецца гарманальны дысбаланс, які прыводзіць да астэапарозу. Вучоныя раяць не захапляцца антыдэпрэсантамі, а часцей ужываць казінае малако, багатае на кальцый.
- Пры сутаргах заліце шклянкай малака 1 ч. лыжку травы дуброўкі (лапчатки), пакіньце на 10—15 хвілін, працадзіце, выпіце настой у гарачым стане. На працягу дня выпівайце яшчэ дзве шклянкі гэтага настою.
- Калі адбылося расцяжэнне сухажылляў, прыкладвайце да балючага месца кампрэсы з гарачага малака. Пасля таго як кампрэс астыне, працэдуру паўтарыце.

-2490-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Колер мае значэнне

Старажытныя індусы сцвярджалі, што рознакаляровыя прадукты больш багатыя на вітаміны, чым іх «шэрыя» сабраты. Менавіта дзякуючы колеру яны выклікаюць ці прыглушаюць апетыт.

Аранжавы. Гэты колер спадабаецца аптымістам і аматарам прыгод. Морква, гарбуз, дыня, апельсін і іншыя прадукты, якія спалучаюць у сабе адценні жоўтага і чырвонага, зараджаюць наш арганізм энергіяй.

Чырвоны. Памідоры, чырвоны перац, руковы грэйпфрут, чырвоная капуста, мяса, клубніцы, чарэшня ратуюць ад дэпрэсіі і змяшчаюць антыаксідант, які ахоўвае клеткі ад старэння. Дыетолагі раяць налягаць на чырвонае тым, хто хоча пахудзець.

Фіялетавы. Тым, хто хоча, наадварот, патаўсцець, трэба есці больш прадуктаў менавіта гэтага колеру, напрыклад, баклажанаў ці бульбы з фіялетавай лупінай. Фіялетавы дабратворна ўплывае на дыханне і дапамагае запаволіць пачашчаны сардэчны рытм.

Сіні. Меню, складзенае цалкам у сініх тонах, незаменнае ў хвіліны, калі вы знаходзіцеся ў абдымках стрэсу. Яны заспакойваюць нервовую сістэму. Цёмны вінаград, чарніцы, слівы багатыя на антацыяны, якія абараняюць крывяносныя сасуды, сэрца, органы зроку.

Жоўты. Прадукты колеру сонца садзейнічаюць канцэнтрацыі ўвагі, развіваюць інтуіцыю. Гэты колер ідэальны для пар, чые пачуцці сталі астываць. Лімонны сок, напрыклад, ачышчае кроў, спрыяе фарміраванню касцявой тканкі і актывізуе работу пячонкі.

Белы. У Італіі часта кажуць: есці па-беламу. Гэта значыць харчавацца простай ежай, а яшчэ ачысціць свой арганізм ад шлакаў. Белы колер прысутнічае не толькі ў макаронных вырабах і рысе, але і ў цыбулі, часнаку, рэпе, карані сельдэрэю і квяцістай капусце.

Зялёны. Ежа зялёнага колеру (салата, гарошак) «зараджае» мазгі. Гэты колер абумоўлены прысутнасцю хларафілу, які стымулюе выпрацоўку чырвоных крывяных цельцаў, што вельмі карысна для здароўя, і актывізуе імунную сістэму.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

БУЛЬБЯНАЯ ТАРЦІЛЛЯ — СЫТНЫ СНЯДАНАК ПА-ІСПАНСКУ

На 2 порцыі: 400 г бульбы, зваранай у мундзірах; 1 цыбуліна; 50 г бекону; 1 салодкі чырвоны перац; 2 ст. лыжкі топленага масла; 4 яйкі; зяленіва.

Абабраную бульбу нарэжце лустачкамі, цыбулю пасячыце, бекон нашаткуйце вузкімі палоскамі, салодкі перац — саломкай. Разагрэйце на патэльні масла, абсмажце бульбу да залацістай скарыначкі. Дадайце бекон, цыбулю і злёгку падсмажце. Падмяшайце перац і зялёную цыбулю, усё разам патушыце 5 хвілін, пасаліце, паперчыце на смак. Узбіце яйкі, заліце імі сумесь з агародніны. На невялікім агні дайце яйкам «схапіцца», затым перавярніце страву на другі бок і смажце яшчэ 2 хвіліны. Раскладзіце на талеркі, пасыпце зяленівам.

САКРЭТЫ ПРЫГАЖОСЦІ

СКУРУ КРЭМАМ НЕ САПСУЕШ?

Скура — не каша, а крэмы, няхай нават і змяшчаюць пэўныя віды тлушчаў, — не масла! Таму «перадазіроўка» крэму не толькі не прывядзе да хуткіх і выдатных вынікаў, але і пасадзейнічае ўзнікненню дадатковых праблем са скурай. Напрыклад, калі вы больш шчодра наляпаеце на ноч крэм на далікатную скуру пад вачыма, не здзіўляйцеся, калі зранку з'явяцца «мяшкі». А злоўжыванне пілінгам можа выклікаць пашкоджанне скуры і, як вынік, — яе запаленне. Таксама не варта замяняць начны крэм дзённым і наадварот.

-2491-

Проектная декларация

БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» на строительство жилого дома ГП-31 в микрорайоне «Сухарево-5» в г. Минске 10-этажного 3-секционного 119-квартирного со встроенным помещением товарищества собственников.

Застройщик: Бобруйское унитарное коммунальное производственное предприятие «Комбинат железобетонных изделий», зарегистрированное решением Могилевского областного исполнительного комитета от 21.10.02 года № 20-12 в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 700385036. Местонахождение: РБ, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 54. Режим работы: понедельник—пятница с 8.00 до 16.30, обеденный перерыв с 12.00 до 12.30.

За период с 2005 по 2007 гг. БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» осуществило строительство 11 жилых домов на 1086 квартир в городах Бобруйске, Минске, Могилеве.

БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» имеет лицензию на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0428622, выданную Министерством архитектуры и строительства РБ на основании решения № 3 от 04.01.2008 г. на срок до 29.01.2013 г. Строительство осуществляется в соответствии с условиями договора о реализации права проектирования и строительства объекта от 31 марта 2006 г., заключенного с Мингорисполкомом.

Проектно-сметная документация разработана ПКУП «Минскпроект», прошла в установленном порядке государственную экспертизу — заключение № 0801-8-2007 от 19.09.2007 г.; государственную экологическую экспертизу — заключение № 665-2007 от 24.10.2007 г.

Получено разрешение государственного строительного надзора на производство строительно-монтажных работ № 2-208Ж-003/08 от 20.02.2008 г.

Получены документы, удостоверяющие права застройщика на земельный участок: свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» от 21.03.2008 г. № 500/577-1569 — на право постоянного пользования; от 20.03.2008 г. № 500/577-1568 — на право временного пользования.

Объект строительства: десятиэтажный трехсекционный 119-квартирный жилой дом по ГП № 31 в микрорайоне «Сухарево-5» в г. Минске.

Конструкция дома: Индивидуальный жилой дом по ГП № 31 запроектирован во Фрунзенском административном районе на территории строящегося микрорайона «Сухарево-5».

Участок свободен от застройки, территория участка 918,4 м².

Проектом предусматриваются:

- планировочная организация дворовой территории с устройством автостоянки на 10 машиномест, детской площадки, площадки для отдыха, хозяйственной площадки, площадки для инвалидов, проездов, тротуаров и дорожек.

Конструкция наружных стеновых панелей принята трехслойная с утеплителем из пенополистирола толщиной 300 мм. Внутренние стены из бетона имеют толщину: межквартирные — 160 мм, межкомнатные — 120 мм. Перегородки в кухне — 60 мм.

Запроектированный жилой дом десятиэтажный, трехсекционный, имеет размеры 15,3х57,6 м. Высота стен этажа принята 2,65 м, стен подвала 2,1—2,4 м. Подземная часть здания решена с техническим подпольем для пропуска инженерных коммуникаций. На первом этаже размещено встроенное помещение товарищества собственников с отдельным входом. Здание оборудовано лифтами и мусоропроводами в лифтовом холле с поэтажным открытием мусороприемных клапанов.

